Як бачна, пры аднолькавай назве, некалькі подобных рухах, і практычна адным песенным матэрэяле, гэтыя фальклорныя абразцы зусім не падобныя адзі на аднаго. Даследаванне культур розных краін паказвае, што ў кожнай з іх ёсць як падабенства, так і адрозненні. Нацыянальная культура адной краіны адрозніваецца ад нацыянальнай культуры іншайкраіны, а разам з тым яны ўваходзяць у агульнае паняцце - сусветная культура.

1. Чурко, Ю.М., Белорусский хореографический фольклор / Ю.М. Чурко. – Мінск: Выш. шк.,1990. – 415 с.

2. Bogucki, Kazimierz. Pięc tancow goralskich z Orawy, Spisza i Pienin. / Bogucki, Kazimierz. – Warszawa: Towarzystwo Łącznosci z Polonią Zagraniczną «Polonia», – 1964.

3. Dziewanowska, Ada. Polish Folk Dances & Songs – a Step by Step Guide. / Dziewanowska, Ada. New York: Hippocrene Books, –1999.

**Яроцкая Р.А.,** студ. 212 гр.
Навуковы кіраўнік – Байко А.П.

## СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ЎЦЯГВАННЯ МОЛАДЗІ Ў САЦЫЯКУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ РЭГІЁНА

У афіцыйных дакументах нашай дзяржавы галоўнай мэтай сацыяльнай палітыкі ў доўгатэрміновай перспектыве з'яўляецца стварэнне ўмоў для развіцця чалавечага патэнцыялу, – рэспубліканскія праграмы «Моладзь Беларусі» на працягу 10 гадоў (2006–2010 гг., 2011–2015 гг.) былі скіраваны на стварэнне ўмоў для больш актыўнага ўключэння моладзі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае жыццё грамадства, развіццё пазітыўных дзіцячых і маладзёжных ініцыятыў [7]; на стварэнне ўмоў для ўсебаковага і гарманічнага развіцця маладых грамадзян краіны, актыўнае іх уключэнне ва ўсе сферы жыццядзейнасці грамадства праз актывізацыю работы па забеспячэнні занятасці моладзі, развіццё прадпрымальніцтва і творчай ініцыятывы маладых людзей, ўзмацненне падтрымкі маладых сем'яў [8, с. 8].

Статыстыка апошніх гадоў сведчыць, што для пэўнай часткі маладых людзей сацыяльныя інстытуты вольнага часу з'яўляюцца вядучымі сферамі сацыяльна-культурнай інтэграцыі і самарэалізацыі. Аднак для большасці маладых людзей дасугавая сфера яшчэ так і не стала звыклым атрыбутам ладу сацыяльна-актыўнага жыцця – моладзь спажывае гатовыя культурныя «прадукты» і не імкнецца для рэалізацыі ўласных культурных ініцыятыў. Таму ў сваім даследаванні мы звярнулі ўвагу на рэгіянальныя сацыяльна-культурныя праекты, якія рэалізуюцца моладзевымі арганізацыямі, і іх патэнцыял ўцягвання моладзі ў сацыякультурнае жыццё рэгіёна. Таму што моладзевы рух з'яўляецца важным індыкатарам ўдасканалення сацыяльна-палітычных адносін у грамадстве і грамадскай сацыялізацыі моладзі.

На падставе абагульнення матэрыялу публікацый беларускіх СМІ, мы вылучылі найбольш папулярныя сярод пасяхова рэалізаваных рэгіянальных праектаў для моладзі напрамкі:

• стварэнне арганізацыйных і сацыяльна-педагагічных умоў для самарэалізацыі, сацыяльнага прызнання і самасцвярджэння моладзі ў культурных цэнтрах (ва ўсіх рэгіёнах);

• фарміраванне патрэбы ў самаўдасканаленні, самаразвіцці (рэгіянальныя фестывалі, конкурсы талентаў і спаборніцтвы, клуб вясёлых і знаходлівых, дзелавыя гульні і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• выхаванне павагі і ўзаемаразумення паміж пакаленнямі (праекты «Жывая памяць»; «Па дарозе дзядоў», «Дапамажы ветэрану» і інш.);

• прафесійнае самавызначэнне і пазітыўнае адносіны да сельскай працы (у 6 рэгіёнах);

• выхаванне асабістай адказнасці за лёс «малой радзімы» («Мы выбіраем Беларусь»; «Родны край»);

• развіццё фізічнай культуры і здаровага ладу жыцця (усе рэгіёны);

• выхаванне пачуцця прыналежнасці, спагады, суперажывання, цікавасці да ўнутранага свету іншага чалавека (валанцёрскія і дабрачынныя акцыі).

Рад публікацый А.А. Макаравай [6] прысвечаны тэме стварэння ўмоў рэалізацыі моладзі ў сферы культуры праз адаптацыю расійскіх мадэляў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці да беларускіх рэалій, як адзін з шляхоў пераўтварэння сучасных рэгіянальных культурных цэнтраў у шматпрофільныя, сацыяльна накіраваныя. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці пры абмежаванай колькасці супрацоўнікаў і наведвальнікаў клубаў-бібліятэк здзейснілі сумяшчэнне двух функцыянальна самастойных падраздзяленняў у адной установе па салоннай мадэлі. Менавіта цікавасць маладых наведвальнікаў да салонаў і іх гатоўнасць да арганізацыі сваёй сацыяльна-культурнай дзейнасці абумовілі выбар мадэлі. На працягу месяца сіламі моладзі рэгіёну абмяркоўваюцца, падрыхтоўваюцца і праводзяцца: літаратурны салон; прававы салон; музычны салон; тэатральна-гумарыстычны салон. Салонная праграма традыцыйная: сустрэча гасцей; знаёмства і прадстаўленні; абазначэнне тэмы вядучым; выступленне гасцей па тэме; салонныя навіны; кароткія цікавыя апавяданні: з мінулага, сучаснасці, будучыні; выступленні госцей салона (песні, танцы, вершы ...); кава, чай; слайды, аматарскія фільмы, запісы, альбомы; салонныя забавы: конкурсы, спаборніцтвы, гульні; адыход

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гасцей (развітанне, праводзіны). Варта адзначыць, што выбар дадзенай мадэлі стымуляваў моладзь да пошуку сродкаў рэалізацыі ўласных задум. Як вынік, салонная мадэль дапамагае ўстанове культуры рэалізоўваць платныя слугі: адзначаць дні нараджэння, гадавіны, юбілеі ў коле сяброў і атмасферы салона, а моладзі – удзельнічаць у сацыяльна-культурным жыцці рэгіёна.

Пад час анкетнага апытання моладзі, якая пражывае на тэрыторыі Карэліцкага раёна мы даведаліся, якія б сацыяльна-культурныя праекты яна (моладзь) гатова арганізаваць уласнымі намаганнямі: «Цэнтр валанцёраў і дабрачынцаў»; «Школа жыццёвага поспеху»; «Кінаклуб без даха»; «Гульнёвы аўтобус», што сведчыць пра гатоўнасць моладзі ўзбагачаць культурнае жыццё рэгіёна і сваё ўласнае. Акрамя таго, анкетаванне пацвердзіла нашу думку, што актыўная праца па арганізацыі змястоўнага вольнага часу моладзі вядзецца з дапамогай ўключэння іх у дзейнасць народных калектываў, клубных фарміраванняў і гурткоў. Пры гэтым прыцягненне моладзі ў органы самакіравання аб’яднанняў – падвышаюць іх лідарскі узровень і патэнцыял пошуку партнёраў для рэалізацыі новых сацыяльна-культурных праектаў.

Раённая статыстыка сведчыць аб штогадовым павелічэнні колькасці ўдзельнікаў дабрачынных і творчых акцый, мерапрыемстваў для дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, інвалідаў, адзінокіх пажылых грамадзян і ветэранаў, якія арганізуюцца ўстановамі культуры, адукацыі, сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і грамадскімі арганізацыямі. Аднак недастатковы ўзровень інфармаванасці моладзі аб мерапрыемствах, якія плануецца падрыхтаваць і правесці на працягу года ўскладняе іх уцягванне. Так, напрыклад, квартальны аналіз мясцовых СМІ пераканаў, што сацыяльна-культурныя мерапрыемствы не анансуюцца, а асвятляюцца ўжо пасля правядзення. Таму неабходна прыняцце мер па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

своечасовай і дакладнай падачы інфармацыі не толькі работнікамі СМІ, але і ўсімі зацікаўленымі бакамі (на сайце адміністрацыі раёна размяшчаць планы і рэгіянальныя праграмы, з кантактамі адказных асоб, да якіх змогуць звярнуцца маладыя зацікаўленыя людзі). Для пацверджання карыснасці апісаных вышэй мер падкрэслім, што каб палепшыць інфармаванне моладзі аб магчымасцях яе ўдзелу ў рэалізацыі маладзёжнай палітыкі ў Карэліцкім раёне, ўсе рэспандэнты прапануюць наступныя крыніцы інфармацыі – сацыяльныя сеткі і інфармацыйныя Інтэрнэт парталы. Сацыяльныя сеткі і іншыя інтэрнэт-праекты з'яўляюцца добрай пляцоўкай для выказвання прапаноў, абмену думкамі і выпрацоўкі рашэнняў, якія ў далейшым могуць быць рэалізаваны у новых сацыяльна-культурных праектах.

Вывучэнне культурных патрэб і запытаў, меркаванняў моладзі аб паслугах, падтрымка іх сацыяльна-культурных ініцыятыў забяспечыць выкананне артыкула 25 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», а далейшае правядзенне навуковых даследаванняў па праблемах моладзі – умова распрацоўкі эфектыўных мерапрыемстваў у сферы дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Такім чынам, у сучасных умовах адбываюцца сур'ёзныя змены ў падыходах да арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці моладзі: карэкціроўка не толькі мэтаў, прыярытэтаў і механізмаў з улікам новых умоў рэалізацыі, аналізу працэсаў, якія адбываюцца ў маладзёжным асяроддзі, але і асаблівасцей мадэрнізацыі на рэгіянальным узроўні тэхналогій уцягвання самой моладзі ў арганізацыю сферы вольнага часу. Толькі тады магчыма прыцягнуць да сябе маладых людзей і выклікаць у іх імкненне ўдзельнічаць у сацыяльна-культурным жыцці рэгіёна, калі гэта жыццё разнастайнае і прывабнае. Кожны сучасны культурна-адпачынкавы цэнтр павінен стаць для моладзі не толькі любімым месцам адпачынку і зносін, але і месцам развіваючага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вольнага часу. Для дасягнення рэальнага ўдзелу моладзі ў сацыяльна-культурным жыцці рэгіёна неабходна выкарыстоўваць пэўны набор тэхналагічных інструментаў, у тым ліку: вучыць моладзь прымаць удзел у культурным жыцці грамадства, пастаянна інфармаваць яе, прадстаўляць сродкі камунікацыі, падтрымліваць маладзёжныя праекты і гатоўнасць маладых людзей прысвяціць сябе службе грамадству і дабрачыннай працы.

---


6. Макарава, А.А. Клубныя ўстановы як суб’ект рэалізацыі прыярытэтаў дзяржаўнай культурнай палітыкі / А.А. Макарава // Весн. Бел. дзярж. ун-та культуры. – 2003. – № 2. – С. 89–95

7. Основные направления Республиканской программы «Молодежь Беларуси» // Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь [Электронный ресурс] – Режим доступа : http://president.gov.by/press23867.html. – Дата доступа : 25.01.2015

8. Программа социально-экономического развития страны на 2011–2015 гг. – Новое лицо белорусского государства: Информационный материал № 11 (83).– Минск : Информационно-аналитический центр при Администрации Президента Республики Беларусь, 2010. – 32 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ